конкурсы

# Любоў у юных сэрцах

**Як шмат вершаў Максіма Багдановіча прагучала нядаўна ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна ў выкананні навучэнцаў школ, гімназій і іншых навучальных устаноў Беларусі і Расіі на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад Зоркай Венеры», што адбываўся летась на працягу снежня ў межах абласнога праекта «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю»!**

Генератарам ідэі і галоўным арганізатарам выступіла згаданая кніжніца, а яе партнёрамі сталі Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Радыёканал «Культура» і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Спаборніцтва было прысвечана класіку беларускай літаратуры і мела на мэце прыцягнуць як мага больш людзей да вывучэння яго спадчыны, стымуляваць творчую актыўнасць вучняў школьных і пазашкольных устаноў. Вечна малады паэт шырока адгукнуўся ў сэрцах моладзі: юнакоў, дзяўчат, нават вучняў малодшых класаў успышкай любові, чуласці, эмпатыі. Усяго было даслана каля 1800 відэаролікаў з запісамі выканання вершаў класіка.

Фота Кастуся Дробава.



Сімвалічныя ўзнагароды.

Многія з работ былі створаны з элементамі тэатралізацыі і пастаноўкі, іншыя — з выкарыстаннем спецыяльных магчымасцей відэамантажу, у некаторых бралі ўдзел не адзін чытальнік, а некалькі, а то і школьны калектыў.

Дасланыя ўдзельнікамі ролікі змяшчаліся на *YouTube*-канале і ў сацыяльных сетках бібліятэкі ў вольным доступе. Сярод сябраў журы, якія ацэньвалі работы з прафесійнага пункта погляду, былі дырэктар бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Наталля Вашчыла, старшыня Мінскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Леанід Крыванос, загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі, рэжысёр і мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» Алеся Сівохіна. Бадай, усе яны падчас урачыстасці былі аднадушныя ў вызначэнні таго, што стала найскладанейшым у выкананні іх задачы: выбіраць найлепшыя работы сярод мноства не проста добрых, а вельмі добрых і амаль прафесійных, зробленых з вялікай любоўю і майстэрствам.

Праходзіла імпрэза анлайн і афлайн: быў наладжаны тэлемост, праз які да беларускіх удзельнікаў далучыліся пераможцы з Расійскай Федэрацыі. Адметнай музычна-лірычнай аздобай вечарыны сталі выступленні капэлы «Санорус» пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Вячаслава Ларына, саліставў Белдзяржфілармоніі Уладзіслава Даніловіча і Ганны Янкоўскай і канцэртмайстра Анатоля Цяльцова, а таксама народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» пад кіраўніцтвам Алесі Сівохінай і Алеся Мойскага.

**Таша ШПАКОЎСКАЯ**

дарэчы

# Гармонія душы і прыроды

**У літаратурным клубе «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 г. Мінска адбылася музычна-паэтычная вечарына паэтэсы, перакладчыцы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Надзеі Буранавай. У зале сабраліся пастаянныя сябры клуба, чытачы бібліятэкі, аматары паэтычнага слова.**

Надзея Сцяпанаўна нарадзілася ў г. Добруш Гомельскай вобласці. Цяпер жыве ў Мінску. Першыя вершы пачала пісаць яшчэ ў дзяцінстве. У студэнцкія гады стварала шаржы на аднакурснікаў.

Калі ёй было сорак сем гадоў, пайшла з жыцця маці. Гэта было вельмі моцнае ўзрушэнне. І тут як выратаванне сталі прыходзіць вершы.

З'яўляецца аўтарам кніг «Подари мне свой дождь...» (2007), «Аромат времени» (2014), падборка вершаў надрукавана ў Анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі «Поэзия русского слова». Калі з'явіліся ўнукі, пачала пісаць і дзіцячыя творы. Выйшлі кнігі для дзяцей «У бабулі Надзі», «Разговорчики в алфавите, или Вкусная азбука», «Вместе с Вутшиком».

У 2023 годзе пабачылі свет кніга «Солнечный остров» і зборнік выбраных лірычных вершаў «Павлюк Трус: Избранное» ў яе перакладзе на рускую мову.

На вершы «Февраль» («И всё-таки немного жаль...»), «Маяк», «В старом парке», «Не спеши уходить…» створаны песні, якія выконвае бард Анатоль Ушанаў (Расія). Раманс на верш «Случайной нежности обман» (музыка І. Ганчарова) спявае Таццяна Азарава (Расія).

Надзея Сцяпанаўна — пазітыўны чалавек, які лічыць, што паэтычны настрой трымаецца на стаўленні да жыцця, на гармоніі душы і прыроды. Мы бачым свет такім, які ён у нашай душы.

**Аляксандра КАРЖАНЕЎСКАЯ**

на развітанне

# Слуга дабрыні сарамлівы…

5 красавіка 2023 года пайшоў з жыцця паэт, журналіст Павел Вераб'ёў.

«Мы лёс чужы не бралі напракат, // Мы не вымольвалі лацвейшай долі. // І басаногі шлях наш — шлях на волю, // Ніхто не змог аспрэчыць, помні, брат. // Таксама не забудзь, хто нас карміў. // Не збыльняжэюць гэтыя быліны. // І не забудзь, як вецер галасіў, // Калі прыгадваў тое, дзе былі мы», — гэтымі радкамі адкрываецца кніга вершаў, эсэ Паўла Вераб'ёва «Не трэба вас…», выдадзеная ў «Мастацкай літаратуры» у 2005 годзе.



Паэт нарадзіўся 7 лістапада 1958 года на Магілёўшчыне, у вёсцы Рабавічы Слаўгарадскага раёна. Пасля заканчэння школы з 1976 да 1985 года працаваў у слаўгарадскай раённай газеце — карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. Адначасова ў 1977—1983 гг. завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1985—1987 гг. — слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы. У 1987—1991 гг. — рэдактар аддзела часопіса «Народная гаспадарка Беларусі», загадчык сектара друку ЦК ЛКСМБ, адказны сакратар газеты «Чырвоная змена», намеснік галоўнага рэдактара газеты «Знамя юности». З 1991-га — галоўны рэдактар газеты «Знамя юности». З 1992-га — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Добры вечар», з 1994 г. — аглядальнік газеты «Мінская праўда». У 1992 годзе прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Першыя вершы надрукаваў у слаўгарадскай раённай газеце ў 1976 годзе.

У 1990 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік вершаў Паўла Вераб'ёва «Крытычная маса». У 1995-м — другая кніга паэзіі «Цёмнае віно». У 2005 годзе — зборнік вершаў і эсэ «Не трэба вас…». Павел Вераб'ёў — лаўрэат прэміі імя М. Багдановіча выдавецтва «Мастацкая літаратура».

«Сляпы падарожнік ідзе па Айчыне, // Спыніцца не можа — шукае святыню. // Не можа знайсці супакойнага дому, // Патрэбна чамусьці святыня сляпому…» («Жыццё без святыні»). Павел Вераб'ёў пакутліва шукаў галоўныя паэтычныя радкі, якія б праўдзіва расказалі пра час і перажыванні, ацэнкі, звязаныя з пільным аглядданнем жыцця. Яго, выдатнага, сумленнага паэта, лёс быў нераздзельны з лёсам Айчыны. Вершы, выпеставаныя яго свядомасцю, — і светлыя, і журботныя, і часам прамалінейна-жорсткія. І гэта зусім не праява мастацкага раскідвання, змены эстэтычных перакананняў. У вонкавай разнастайнасці, шматпланавасці трывалым застаецца галоўны стрыжань паэтычнай сілы Паўла Вераб'ёва: падараваныя ім сучасніку паэтычныя радкі — шчыры, праўдзівы, смелы адбітак жыцця.

Ёсць у паэта верш «Загадка шаравой маланкі»… «Слуга дабрыні сарамлівы // Адноўчы ў адчаі рашыў: // «Пэўна, каб стаць шчаслівым, // Варта пазбыцца душы». // Душу пусціў пехатою, // Сам па свеце пайшоў наўздагад. // Хто палёт твой, душа, супакоіць // І ці вернешся ты назад? // Над сялом, над бацькоўскім дахам, // Над грузам штодзённых турбот // Прамільгнула імклівым птахам // І знікла ў сумётах год. // Адрокся пакутнай ношы, // Ды стала цяжэй — хоць крычы. // І лёсам зрабіўся пошук // Адрынутай птушкі-душы. // Бясрэбранік, вечны вандроўнік. // Тамленне па свеце вяло. // Маліўся на зоры і поўню — // Прыбіўся ў сваё сяло…» Шчыры служка паэтычнай дабрыні, мастак слова, які многімі сваімі вершамі здзейсніўся як яркая мастацкая асоба, пайшоў у «сваё сяло»… Пайшоў следам за сваімі магілёўскімі сурodзічамі — Міхасём Стральцовым, Аляксеем Пысіным, Алесем Пісьмянковым… Ім, сапраўдным паэтам, будзе пра што пагаварыць у «сваім сяле» вечнай Айчыны, вечнага прытулку…

**Мікола БЕРЛЕЖ**

«ЛіМ»-люстэрка

Фотавыстаўкі пра Беларусь і Расію адкрыліся ў Кішынёве, піша БелТА. Пры падтрымцы пасольстваў Беларусі і Расіі беларуская і руская дыяспары Малдовы арганізавалі тэматычныя фотаэкспазіцыі, прысвечаныя Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Фотавыстаўка Нацыянальнай бібліятэкі «Беларусь — цудоўныя імгненні» прадстаўлена ў Расійскім цэнтры навукі і культуры. У Беларускім культурным цэнтры адкрылася выстаўка фатаграфій "У аб'ектыве — шматнацыянальная Расія". З нагоды свята пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова перадало ў дар Рускаму дому ў Кішынёве кнігі пра Беларусь. Акрамя таго, была падрыхтавана музычная праграма — народная артыстка Малдовы Маргарыта Ивануш выканала вакальныя творы на тэму патрыятызму і любові да сваёй Радзімы. На адкрыцці выставак прысутнічалі прадстаўнікі беларускай і расійскай дыпламатычных місій, нацыянальных дыяспар Беларусі і Расіі ў Малдове, дзеячы культуры.

Новы драматычны тэатр Мінска пакажа спектакль «Я рэч…» на сцэне Кінешэмскага драматычнага тэатра імя А. М. Астроўскага на VI Міжнародным фестывалі рускай класічнай драматургіі «Гарачае сэрца» ў Расіі. Як гаворыцца на сайце ўстановы культуры, фэст працягнецца дзесяць дзён. У яго праграме значацца спектаклі тэатраў «Сфера», «Школа драматычнага мастацтва», Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя У. Маякоўскага і іншых калектываў. Адкрые свята пастаноўка «Жартаўнікі» тэатра «Сатырыкон». Гэта спектакль-парадокс рэжысёра Яўгена Марчэлі.

Мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра, лаўрэат дзяржаўных прэмій, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Валерый Анісенка ў пачатку красавіка пачне рэпетыцыі новага спектакля ў Расіі — на сцэне знакамітага Пермскага тэатра «Каля Моста». Для сумеснай працы абрана п'еса Аляксея Дударава «Вечар», гаворыцца на сайце «СБ. Беларусь сегодня». «Тэма каранёў, роду, памяці, вёскі для Беларусі і Расіі агульная, — адзначае заснавальнік і мастацкі кіраўнік тэатра Сяргей Фядотаў. — Па-другое, спектакль будуць іграць на беларускай мове, прычым гэта не адзіная пастаноўка па ім у рэпертуары Пермскага тэатра "Каля Моста": ужо шэсць гадоў з вялікім поспехам у нас ідзе "Камедыя". Такі ход — наша прызнанне ў любові Беларусі».

Кнігу вершаў «Лісты Магамеда» азербайджанскага паэта Магамеда Гаджыева прэзэнтавалі ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, паведамляе БелТА. Малады літаратар жыве і працуе ў Беларусі. У зборнік увайшлі новыя вершы аўтара і іх пераклады на беларускую мову Таццянай Сівец, Юліяй Алейчанкай, Міколам Шабовічам. На прэзентацыі прысутнічалі каля 40 чалавек, сярод якіх — аматары мастацкага слова і перакладчыкі. У далейшым паэт плануе займацца перакладам твораў Якуба Коласа і Максіма Багдановіча на азербайджанскую мову, што дазволіць развіваць беларуска-азербайджанскае літаратурнае супрацоўніцтва.

У Маскве аб'явілі конкурсную праграму 45-га Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю (ММКФ). Ён пройдзе з 20 да 27 красавіка, перадае РІА «Новости». Фестываль адкрые вострасюжэтны трылер «Снягір» Барыса Хлебнікава. У асноўным конкурсе пакажуць сіквел меладрамы «14+», «Першае каханне» (Расія), «Нявесту мерцвяка» (Румынія), «Далікатныя кветкі плыні дзён» (Японія) і іншыя стужкі. На перамогу прэтэндуюць карціны з Расіі, Бангладэша, Кітая, Аргенціны, Сербіі і іншых краін. Усяго ў конкурсе заяўлена 12 праектаў. Журы ўзначаліць індыйскі рэжысёр Рахуль Равель («Арджун»). Кампанію яму складуць акцёры Аляксей Гуськоў, Святлана Іванова і Самал Яслямава, а таксама калумбійскі пастаноўшчык Сіра Гера («Абдымкі змея»).

Самы ранні поўны запіс канцэрта *The Beatles* у Вялікабрытаніі 60-гадовай даўніны апублікаваны вяшчальнай карпарацыяй «Бі-бі-сі». Як перадае «ИТАР-ТАСС», яна была зроблена 4 красавіка 1963 года 15-гадовым школьнікам Джонам Блумфілдам падчас выступлення рок-групы ў прыватным інтэрнаце Стоу (графства Бакінгемшыр). Пол Макартні, Рынга Стар, Джон Ленан і Джордж Харысан прыехалі ў навучальную ўстанову па просьбе вучня Дэвіда Мурса, прадстаўніка сям'і бізнесменаў, які напісаў ліст-запрашэнне менеджару ліверпульскай чацвёркі Браяну Эпстайну. Па словах Джона Блумфілда, ён запісаў выступленне на свой новы бабінны магнітафон. Незадоўга да канцэрта ў школе, 22 сакавіка 1963 года, выйшаў дэбютны студыйны альбом *The Beatles* «*Please Please Me*».

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**